ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.11.2023 № 500

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» (навейшы час)
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2024 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» (навейшы час) прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Вызначальным прынцыпам складання праграмы ўступных іспытаў з'яўляецца спалучэнне падзейна-храналагічнага і праблемна-тэарэтычнага ўзроўняў вывучэння гісторыі.

Паказчыкамі ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў з'яўляюцца засваенне тэарэтычнага, фактычнага, храналагічнага, картаграфічнага і ацэначнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў і адпаведных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Уступныя іспыты па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» (навейшы час) праводзяцца з выкарыстаннем тэстаў. Змест тэставых заданняў вызначаецца дадзенай праграмай уступных іспытаў.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

Абітурыент павінен в е д а ц ь асноўны тэарэтычны і фактычны вучэбны матэрыял, арыентавацца ў найважнейшых падзеях навейшага часу.

Абітурыент павінен у м е ц ь:

устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі, падзеямі і з'явамі;

параўноўваць гістарычныя факты;

сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты, рабіць на гэтай аснове аргументаваныя вывады;

канкрэтызаваць тэарэтычныя вывады і гістарычныя паняцці;

характарызаваць і ацэньваць дзейнасць гістарычных асоб;

лакалізоўваць гістарычныя падзеі ў часе і прасторы;

выкарыстоўваць змест гістарычнай карты для выяўлення асаблівасцей эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця краін.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ (1918–1945 гг.)

### 1. КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША У 1918–1939 гг.

*Зацвярджэнне асноў пасляваеннага свету.* Наступствы Першай сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя і яе вынікі. Версальскі мірны дагавор. Стварэнне Лігі Нацый. Вашынгтонская канферэнцыя. Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.

*Краіны Захаду ў 1918–1929 гг.* Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі. Рэвалюцыйны ўздым у іншых краінах Еўропы. Вытокі фашызму ў Еўропе. Усталяванне фашысцкага рэжыму ў Італіі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ў перыяд стабілізацыі. Міжнародныя адносіны.

*Сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. (Вялікая дэпрэсія).* Прычыны, асноўныя рысы і асаблівасці сусветнага эканамічнага крызісу. Шляхі выхаду з крызісу. «Новы курс» Ф.Д. Рузвельта. Наступствы сусветнага эканамічнага крызісу. Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі. Ідэалогія і практыка фашызму.

*Заходні свет напярэдадні Другой сусветнай вайны. Барацьба супраць фашызму.* Усталяванне фашысцкага рэжыму ў Германіі. Народны фронт у Францыі. Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі. Антыфашысцкі рух.

*Міжнародныя адносіны ў 1930-х гг.* Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Агрэсіўная палітыка фашысцкіх дзяржаў. Фарміраванне блока агрэсіўных дзяржаў. Мюнхенская канферэнцыя. Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Палітыка «прымірэння агрэсара» і яе вынікі. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні.

*Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў міжваенны перыяд.* Утварэнне новых незалежных дзяржаў пасля Першай сусветнай вайны. Усталяванне аўтарытарных рэжымаў. Акупацыя Чэхаславакіі. Польшча перад пагрозай германскай агрэсіі.

*Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд.* Новыя тэндэнцыі ў развіцці навукі і культуры. Прыродазнаўчыя навукі і навукова-тэхнічны прагрэс. Грамадскія навукі. Супярэчлівы характар развіцця навукі. Працяг традыцый рэалізму ў літаратуры. Пошукі новых форм у мастацтве. Кіно. Архітэктура.

### 2. САВЕЦКАЯ ДЗЯРЖАВА Ў 1917–1939 гг.

*Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Расіі.* Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе. Усталяванне савецкай улады ў Расіі. Брэсцкі мір. Значэнне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

*Грамадзянская вайна.* Прычыны і этапы Грамадзянскай вайны ў Расіі. Асноўныя сілы і ўдзельнікі Грамадзянскай вайны. Ваенныя дзеянні на франтах Грамадзянскай вайны. Прычыны перамогі Чырвонай Арміі. Наступствы Грамадзянскай вайны.

*Курс на пабудову сацыялізму.* Палітыка «ваеннага камунізму». Эканамічны і палітычны крызіс у краіне. Новая эканамічная палітыка. Індустрыялізацыя і калектывізацыя. Вынікі эканамічнай трансфармацыі.

*Палітычнае развіццё савецкай дзяржавы.* Утварэнне СССР і яго гістарычнае значэнне. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Развіццё адносін з краінамі Захаду. Барацьба СССР за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі.

*Культурныя пераўтварэнні ў СССР у 1920–1930-я гг.* Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі. Навуковыя адкрыцці. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Савецкая дзяржава і царква.

## 3. КРАІНЫ ЎСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ Ў 1918–1939 гг.

*Кітай у міжваенны перыяд.* Кітайская Рэспубліка пасля Першай сусветнай вайны. Нацыянальная рэвалюцыя 1925–1928 гг. Грамадзянская вайна 1928–1937 гг. Агрэсія Японіі ў Кітаі ў 1930-я гг. Развіццё культуры.

*Індыя ў міжваенны перыяд.* Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў 1918–1922 гг. Ідэалогія гандызму. Саляны паход. Культура і лад жыцця індыйцаў.

*Японія ў міжваенны перыяд.* Праблемы японскай эканомікі. Уплыў сусветнага эканамічнага крызісу на Японію. Палітычнае развіццё. Прыход мілітарыстаў да ўлады. Знешняя палітыка. Культура Японіі.

*Мусульманскі свет у міжваенны перыяд.* Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі 1918–1923 гг. Рэформы ў Іране. Дасягненне незалежнасці Афганістанам. Барацьба егіпецкага народа за незалежнасць. Культура і лад жыцця.

*Лацінская Амерыка ў міжваенны перыяд.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Палітыка ЗША ў адносінах да краін Лацінскай Амерыкі. Асаблівасці палітычнага развіцця: Аргенціна, Бразілія, Мексіка. Культура Лацінскай Амерыкі.

## 4. ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА.

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА

*Пачатак Другой сусветнай вайны.* Прычыны і характар Другой сусветнай вайны. Перыядызацыя вайны. Пачатак баявых дзеянняў. Захоп еўрапейскіх дзяржаў нацыскай Германіяй.

*Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.* Напад гітлераўскай Германіі на СССР. Правал стратэгіі «маланкавай вайны» супраць СССР. Бітва за Маскву. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі.

*Карэнны перапом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.* Вырашальныя перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе. Ваенныя дзеянні армій ЗША і Англіі ў канцы 1942–1943 гг. Капітуляцыя Італіі. Вайна на Ціхім і Атлантычным акіянах. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

*Антыфашысцкая барацьба на акупаваных тэрыторыях СССР і краін Еўропы.* Фашысцкі «новы парадак». Рух Супраціўлення ў акупаваных краінах Еўропы. Барацьба савецкага народа ў тыле ворага.

*Савецкі тыл падчас вайны.* Перавод эканомікі на ваенны лад. Абаронная прамысловасць. Працоўны гераізм савецкага народа. Руская Праваслаўная Царква ў гады вайны. Штодзённае жыццё савецкіх людзей у тыле. Становішча ў блакадным Ленінградзе.

*Заключны этап Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.* Пачатак вызвалення Чырвонай Арміяй еўрапейскіх краін. Адкрыццё другога фронту. Крымская (Ялцінская) канферэнцыя і яе рашэнні. Капітуляцыя Германіі. Патсдамская канферэнцыя. Паражэнне Японіі. Стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Цана і значэнне Перамогі. Вынікі і ўрокі Другой сусветнай вайны.

# Раздзел II. СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ: 1945 – ПАЧАТАК XXI ст.

## 5. КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1945 – ПАЧАТКУ XXI ст.

*Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны.* Абвастрэнне супярэчнасцей паміж заходнімі дзяржавамі і СССР. «Халодная вайна». Разрадка міжнароднай напружанасці. Паварот ад разрадкі да канфрантацыі. «Дзяржава ўсеагульнага дабрабыту». Неакансерватыўная рэвалюцыя. Крызісныя з'явы 1970–1980-х гг. у краінах Заходняй Еўропы. Распад СССР і яго наступствы. Паглыбленне інтэграцыі і працэсы дэзынтэграцыі ў сучасным свеце.

*Фарміраванне постындустрыяльнага грамадства.* Новая эпоха ў развіцці навукі і тэхнікі. Камп'ютарная рэвалюцыя. Прарыў у медыцыне. «Зялёная рэвалюцыя». Супярэчлівы характар НТР. Змяненні ў сацыяльнай структуры грамадства.

*Злучаныя Штаты Амерыкі.* Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё. Расавая праблема. «Неакансерватыўная рэвалюцыя». Пераадоленне эканамічнага крызісу і вырашэнне сацыяльных праблем. Знешняя палітыка.

*Вялікабрытанія.* Распад Брытанскай каланіяльнай імперыі. Унутраная і знешняя палітыка ў 1945–1964 гг. Ірландская (Ольстэрская) праблема і шляхі яе вырашэння. Тэтчарызм. Вялікабрытанія ў канцы XX – пачатку XXI ст.

*Францыя.* Рэжым Чацвёртай Рэспублікі. Распад Французскай каланіяльнай імперыі. Пятая рэспубліка. Знешняя палітыка. Эканамічны ўздым у Францыі ў канцы 1950–1960-х гг. Палітычны крызіс 1968 г. Францыя ў канцы XX – пачатку XXI ст.

*Федэратыўная Рэспубліка Германіі і Германская Дэмакратычная Рэспубліка. Аб'яднанне Германіі.* Фарміраванне дзвюх нямецкіх дзяржаў пасля Другой сусветнай вайны. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ФРГ. Будаўніцтва і крызіс сацыялізму ў ГДР. Аб'яднанне Германіі. ФРГ у канцы XX – пачатку XXI ст.

*Італія.* Пасляваенныя дэмакратычныя пераўтварэнні. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1950–1970-х гг. Праблема Поўдня. Унутрыпалітычны крызіс 1970–1980-х гг. Палітычныя перамены ў канцы XX – пачатку XXI ст. Знешняя палітыка.

*Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы.* Пераўтварэнні першых пасляваенных гадоў. Поспехі і цяжкасці сацыялістычнага будаўніцтва. Нарастанне крызісу сацыялізму. «Аксамітныя рэвалюцыі» 1989–1991 гг. Распад Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславія. Грамадзянская вайна ў Югаславіі. Распад Чэхаславакіі. Інтэграцыя ў еўрапейскія структуры і Паўночнаатлантычны альянс (НАТА).

*Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША.* Новыя з'явы ў развіцці культуры. Развіццё навукі і адукацыі. Грамадскія навукі. Фарміраванне інфармацыйнага грамадства. Элітарная і масавая культура. Кінематограф. Выяўленчае мастацтва. Мастацкая літатарура. Архітэктура. Захаванне традыцыйных культур.

## 6. СССР. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ (1945 г. – ПАЧАТАК XXI ст.)

*СССР у 1945–1953 гг.* Аднаўленне народнай гаспадаркі. Палітычнае развіццё краіны. Палітычныя рэпрэсіі. Знешняя палітыка.

*СССР у 1953–1964 гг.* СССР пасля смерці І.В. Сталіна. XX з'езд КПСС і яго рашэнні. Рэформы другой паловы 1950-х – першай паловы 1960-х гг. Знешняя палітыка.

*СССР у сярэдзіне 1960-х – пачатку 1980-х гг.* Эканамічная рэформа А.М. Касыгіна і яе вынікі. Эпоха «развітога сацыялізму». Грамадска-палітычнае жыццё. Канстытуцыя 1977 г. Праблемы знешняй палітыкі СССР.

*Палітыка перабудовы і распад СССР.* Крызіс 1980-х гг. Перабудова і крах палітыкі М.С. Гарбачова. Рэформа палітычнай сістэмы і яе наступствы. Жнівеньскі палітычны крызіс 1991 г. Распад СССР і стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

*Расійская Федэрацыя.* Расія на шляху да суверэнітэту. Радыкальная эканамічная рэформа. Кастрычніцкія падзеі 1993 г. і прыняцце Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў 1994–1999 гг. Расія ў пачатку XXI ст. Знешнепалітычныя выклікі.

*Навука і культура ў СССР і Расійскай Федэрацыі.* Адукацыя. Навука. Мастацкая культура і літаратура. Духоўнае жыццё Расіі ў канцы XX – пачатку XXI ст.

## 7. КРАІНЫ АЗІІ, АФРЫКІ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*Распад каланіяльнай сістэмы.* Асноўныя этапы вызваленчай барацьбы народаў каланіяльных і залежных краін. Здабыццё незалежнасці. Краіны, якія развіваюцца. «Халодная вайна» і «трэці свет». Неакаланіялізм. Новыя дзяржавы ў пошуках стабільнасці. Перашкоды на шляху развіцця.

*Кітай.* Утварэнне КНР. Аднаўленчы перыяд. Палітыка «трох чырвоных сцягоў». «Курс на рэгуляванне эканомікі». Мэты, характар і вынікі «культурнай рэвалюцыі». Рэфармаванне кітайскага грамадства пасля смерці Маа Цзэдуна. Рэформы 1980–1990-х гг. і іх вынікі. Знешняя палітыка КНР.

*Японія.* Пасляваенная Японія. Сан-Францыскі дагавор 1951 г. Эканамічнае развіццё. Палітычнае развіццё. Сучасная Японія.

*Індыя.* Дасягненне незалежнасці. Індыя – брытанскі дамініён. Утварэнне рэспублікі. «Курс Неру». Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Індыі ў 1964 г. – пачатку XXI ст. Праблемы знешняй палітыкі.

*Краіны мусульманскага свету.* Агульная характарыстыка. Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі ў арабскім свеце. Егіпет, Іран, Турцыя.

*Краіны Лацінскай Амерыкі.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Палітычнае жыццё. Рэформы, ваенныя дыктатуры і рэвалюцыі (Мексіка, Куба, Чылі, Бразілія).

*Лакальныя войны і канфлікты.* Араба-ізраільскі канфлікт. Вайна ў В'етнаме. Карэйская вайна. Войны ў Афганістане і зоне Персідскага заліва.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 – пачатак XXI ст.: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, М.А. Краснова, Н.У. Кошалева; пад рэд. У.С. Кошалева; пер. на беларус. мову В.Р. Ермаковіч, А.А. Цвірко, Т.М. Шахмуць. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2019. – 255 с.: іл.

2. Атлас. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 г. – пачатак XXI ст. 9 клас / В.У. Барысенка, А.Я. Ігнатовіч, П.Г. Лук'янаў. – Мінск: Белкартаграфія, 2019.

3. Сусветная гісторыя, XIX – пачатак XXI ст., вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / У.С. Кошалеў, Н.У. Кошалева, М.А. Краснова; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2021. – 264 с.: іл.

4. Атлас. Сусветная гісторыя, XIX – пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 11 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.С. Кошалеў, Д.Г. Ларыёнаў. – Мінск: Белкартаграфія, 2022.

5. Атлас. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэбны дапаможнік для 9,11 кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.А. Каваленя, М.Г. Жылінскі, А.А. Лукашоў – Мінск: Белкартаграфія, 2021.